**„Калі мы Палессе прывядзём у парадак, мы толькі за кошт Палесся накормім усю краіну. Палессе кінуць нельга.**

*Аляксандр Лукашэнка падчас рабочай паездкі ў Пінскі раён Брэсцкай вобласці пры наведванні ААТ «Парахонскае». 1 кастрычніка 2024 года.*

# Калі жыць і працаваць на зямлі прэстыжна

Узорам таго, як трэба працаваць на зямлі, назваў кіраўнік дзяржавы землі «Парахонскага», дзе дасягнуты высокі ўзровень гаспадарання і развіцця сацыяльнай сферы. «Чыста, прыгожа», — сказаў Прэзідэнт. І параіў іншым гаспадарнікам, чыноўнікам звяртацца ў «Парахонскае» па вопыт.

Гісторыя сельгаспрадпрыемства «Парахонскае» пачынаецца з першых калгасаў пасляваеннага часу. Але ж літаральна новае жыццё ў гэты край прынесла маштабная меліярацыя беларускага Палесся. У далёкім 1974 годзе меліяратары перадалі саўгасу «Парахонскі» першыя 2500 гектараў акультураных земляў былых балот. Гаспадарка пачала ўзводзіць жывёлагадоўчыя комплексы, цэхі па прыгатаванні кармоў, склады і іншыя гаспадарчыя памяшканні. Пасёлак тым часам прырастаў інфраструктурай. За паўстагоддзя «Парахонскае» перажывала розныя перыяды, былі ўзлёты і падзенні. Але, як бы цяжка ні было, у Парахонску не спынялася развіццё інфраструктуры. Напрыклад, у 2005 годзе ён стаў першым сельскім населеным пунктам краіны, дзе адкрылі спартыўную пляцоўку са штучным пакрыццём для заняткаў міні-футболам.

Асабліва дынамічна развівалася сельгаспрадпрыемства апошнія два дзесяцігоддзі. Тут пабудавалі і рэканструявалі шэраг сельскагаспадарчых аб'ектаў, узводзілі жыллё, паляпшалі інфраструктуру. У 2012 годзе была завершана газіфікацыя аграгарадка. Вялікая ўвага ўдзялялася падтрыманню ў парадку меліяраваных угоддзяў, добраўпарадкаваліся вуліцы і дарогі ўнутры гаспадаркі.

Сёння ААТ «Парахонскае» мае каля 26 тысяч гектараў сельгасугоддзяў, 26 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы. Дарэчы, удой на адну карову па выніках года перавысіў адзнаку ў 10 870 кілаграмаў. Цэх механізацыі складаюць больш за 140 трактараў, 35 камбайнаў, 110 грузавых, 32 легкавыя аўтамабілі, 17 аўтобусаў.

У складзе гаспадаркі — шэсць малочнатаварных комплексаў, комплекс па дарошчванні і адкорме маладняку буйной

парадкаў вышэй. З 2009 года мы рухаліся шпаркімі крокамі. Па-першае, была аграмадная падтрымка, па-другое, аграмаднае жаданне. Людзі працавалі на новай тэхніцы, атрымлівалі прыстойную зарплату і ўтрымлівалі свае сем'і. Жыць у Парахонску і працаваць у ААТ «Парахонскае» сёння прэстыжна. Працоўныя і культурныя традыцыі старэйшага пакалення працягвае моладзь, і гэта радуе».

**Галіна ДУБІНА** працуе галоўным бухгалтарам ААТ «Парахонскае» больш за 15 гадоў. Яна падкрэсліла, што гаспадарка выпускае 23 працэнты валавой прадукцыі раёна пры тым, што займае ўсяго 15 працэнтаў тэрыторыі:

— Умовамі жыцця наш аграгарадок нічым не адрозніваецца ад вялікага горада. У нас цалкам добраўпарадкаванае жыллё, прыгожыя, сучасныя вуліцы. Дзеці маюць магчымасць займацца спортам, музыкай, творчасцю розных кірункаў, для гэтага ёсць усе ўмовы.

У вёсцы цудоўна арганізавана гандлёвае абслугоўванне, нават з горада людзі закупляюцца ў нашых крамах. Ну, а што такое прыстойная зарплата, думаю, не варта расказваць. Яна азначае найперш, што працаўнікі могуць спакойна аплачваць крэдыты, вучыць дзяцей, дазваляць сабе паездкі на адпачынак. У нас ёсць уся патрэбная інфраструктура: школы, садкі, участковая бальніца. Моладзь ад нас не збягае ў горад. Кажу гэта на прыкладзе сваёй сям'і. Усе тры мае сыны скончылі ВНУ сельскагаспадарчага профілю і вярнуліся на работу ў сваю гаспадарку. Маладыя маюць перспектыву як у забеспячэнні жыллём, так і ў прафесійным росце. Усе маладыя спецыялісты атрымліваюць кватэры. Гэтае жыллё даволі хутка вызваляецца, бо многія аддаюць перавагу будаўніцтву ўласнага дома, ды і гаспадарка ўзводзіць дамы.

Калі бачыш вынікі сваёй працы, яе сэнс, калі ёсць умовы для жыцця і работы, то ёсць настрой жыць і працаваць. Думаю, што менавіта ў тым кірунку, які мы асвойваем, і павінна развівацца сельскагаспадарчая галіна краіны. На

рошчванні і адкорме маладняку буйной рагатай жывёлы, які складаецца з пяці аддзяленняў, і ферма па вырошчванні цялушак. Шэсць вытворчых участкаў адведзены пад раслінаводчую прадукцыю, ёсць уласныя цэхі па вытворчасці камбікармоў, перапрацоўцы алейных культур, сушцы і грануляванні травяністых кармоў, вытворчасці паліўных брыкетаў. У штаце «Парахонскага» працуе больш за 750 чалавек.

Летась, калі святкавалі 50-годдзе гаспадаркі, яе **дырэктар Уладзімір ХРАЛЕНКА** падкрэсліў, што цяперашнія вынікі роўна ўдвая перавышаюць тыя, што былі чвэрць стагоддзя таму: «І па надоях малака, і па валавым зборы зерня. Цяпер нават цяжка падлічыць, у колькі разоў мы паднялі свой патэнцыял у тэхніцы, у будынках і збудаваннях. Літаральна ва ўсім мы на некалькі сельскагаспадарчая галіна краіны. На першым месцы — паспяховая, эканамічна абгрунтаваная вытворчасць, за ёй ідзе абавязковае развіццё інфраструктуры. Калі гэта ёсць, то з'явіцца трэці складнік у выглядзе культурных праектаў, грамадзянскіх ініцыятыў. Гэта я назіраю як дэпутат сельскага Савета. Моладзі ў нас дастаткова, яна пастаянна ініцыіруе экалагічныя, краязнаўчыя, іншыя акцыі і становіцца іх актыўным удзельнікам. Людзі ўсіх пакаленняў займаюцца спортам, удзельнічаюць у рабоце самадзейных калектываў, выязджаюць на канцэрты і прымаюць гасцей артыстаў.

У нас наогул бывае шмат гасцей. А цяпер іх колькасць расце яшчэ і за кошт калег, якія едуць у Парахонск па вопыт. Кожны месяц прымаем некалькі такіх дэлегацый.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**